МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК
Кафедра сацыяльнай камунікацыі

ВОЛКАВА Кацярына Аляксееўна

# РЭКЛАМА ЯК ІНСТРУМЕНТ РАЗВІЦЦЯ ГЕНДАРНАЙ РОЎНАСЦІ Ў ІНФАРМАЦЫЙНЫМ ГРАМАДСТВЕ

Магістарская дысертацыя
АНАТАЦЫЯ
Спецыяльнасць 1-23 80 11 Камунікацыі

Навуковы кіраўнік:
Яфімава Надзея Віктараўна
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт

Мінск, 2023

# АНАТАЦЫЯ

Магістарская дысертацыя магістранткі кафедры сацыяльнай камунікацыі факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Волкавай Кацярыны Аляксееўны "Рэклама як інструмент развіцця гендэрнай роўнасці ў інфармацыйным грамадстве" прысвечана вывучэнню ўплыву рэкламы на развіццё гендэрнай роўнасці ў сучасным грамадстве. У працы выяўлена дынаміка гендарных стэрэатыпаў у рэкламнай камунікацыі; прааналізавана рэакцыя грамадства на новыя мужчынскія і жаночыя вобразы ў рэкламнай камунікацыі ў новых медыя; праведзены візуальны аналіз гендарных рэкламных вобразаў; даследавана ўзаемасувязь гендарнай ідэнтычнасці асобы з асаблівасцямі ўспрымання гендарных вобразаў у рэкламе.

Аб'ект даследавання магістарскай дысертацыі – рэкламныя паведамленні, якія змяшчаюць мужчынскія і жаночыя вобразы.

Прадмет даследавання магістарскай дысертацыі – уплыў рэкламы на развіццё гендарнай роўнасці ў інфармацыйным грамадстве.

Мэта работы – на падставе візуальнага аналізу рэкламных паведамленняў, якія змяшчаюць гендарныя вобразы, і вывучэння асаблівасцей іх успрымання і рэакцыі грамадства на рэкламу ў новых медыя зрабіць выснову аб значнасці рэкламы ў развіцці гендарнай роўнасці ў сучасным інфармацыйным грамадстве.

*Ключавыя словы: рэклама, мэтавая аўдыторыя, гендар, гендарная ідэнтычнасць, інфармацыйнае грамадства, новыя медыя, гендарная роля, гендарныя вобразы, гендарныя стэрэатыпы, гендарнае равенства, візуальны аналіз, архетып, успрыманне рэкламы.*